WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

15 КРАСАВІКА 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 70
(26934)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ТРАГЕДЫЯ НЕ ПАВІННА АЗЛОБІЦЬ ЛЮДЗЕЙ, ПАСЕЯЦЬ У ІХ ДУШАХ ЗЕРНЕ ВАРОЖАСЦІ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запаліў свечку ў памяць аб ахвярах тэракта і прысутнічаў на памінальнай малітве ў царкве пры Доме міласэрнасці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы ўчора сустрэўся з членамі Сінода Беларускай праваслаўнай царквы ў Доме міласэрнасці. У час сустрэчы ішла размова аб актуальных пытаннях супрацоўніцтва дзяржавы і Беларускай праваслаўнай царквы. Напярэдадні гэтай сустрэчы Аляксандр Лукашэнка паразмаўляў з Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сённяшняя сустрэча сапраўды праходзіць у журботны перыяд. «Гэта асаблівы смутак, звязаны з неардынарнай падзеяй, нехарактэрнай для нашай дзяржавы», — адзначыў беларускі лідар.

Ён падкрэсліў, што вывады абавязкова будуць зроблены. І яны робяцца, але галоўны вывад у тым, што «беларусы прадэманстравалі свае сапраўдныя вялікія рысы, характэрныя для нацыі». «У выніку мы аб'ядналіся, мы адзіныя, як ніколі, — падкрэсліў Прэзідэнт. — І тыя рэдкія галасы, якія сёння гучаць, у тым ліку і розных СМІ, гэта як водгулле мінулага».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Людзі зразумелі адно, што толькі разам мы можам процістаяць любому злу і, аб'яднаўшыся, мы можам выстаяць. Мяне ў гэтай сітуацыі хвалюе толькі адно. Нам бы ў сувязі з гэтым не азлобіцца, каб у нашых душах не было пасеяна зерне варожасці, каб нашы людзі не глядзелі скоса адзін на аднаго. Вось гэту мяжу ні ў якім выпадку нельга перайсці. Адказваць павінны тыя, хто вінаваты. Нам ні ў якім выпадку нельга перагнуць палку, тым больш што гэтыя падзеі, на наша шчасце, не маюць сістэмнага характару».

«Самае цяжкае, што гінуць бязвінныя людзі, якія не маюць ніякага дачынення да тых ці іншых працэсаў, якія маглі б стаць прычынай гэтага злачынства», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў важную ролю Царквы ў падтрыманні міжэтнічнага і канфесійнага міру, паважлівага стаўлення да духоўнай разнастайнасці народаў Беларусі. «Сёння ваша грамадзянская пазіцыя і пастарскае слова прызначаны садзейнічаць умацаванню стабільнасці і спакою ў грамадстве», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, найноўшая гісторыя незалежнай Беларусі стала часам адраджэння і актыўнага развіцця Праваслаўнай царквы. І немалы ўклад у гэта ўнесла дзяржава. За выключэннем Расіі, больш нідзе ў свеце праваслаўныя арганізацыі не маюць той магутнай і сістэмнай падтрымкі, як у Беларусі. Аляксандр Лукашэнка заявіў, што дзяржава «ідзе і будзе ісці насустрач Царкве заўсёды і ва ўсім, вядома, зыходзячы з эканамічных магчымасцяў».

Наша ўзаемадзеянне трэба ператварыць ва ўзаемакарыснае супрацоўніцтва. Свецкая і духоўная ўлады павінны стаць паўнацэннымі партнёрамі. Беларуская праваслаўная царква прызначана жыць інтарэсамі краіны, выкарыстоўваючы пры неабходнасці дзеля іх абароны ўсе свае сувязі і міжнародны аўтарытэт. Яе голас павінен быць больш выразна чуваць, калі таго патрабуе сітуацыя, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што для дзяржавы важныя меркаванне і погляды Царквы на многія працэсы сучаснасці. «Лічу, разам мы знойдзем рашэнне самых складаных пытанняў. І нам, і Царкве патрэбна актывізацыя. Мы павінны дзейнічаць аператыўна, хутка, часам на апярэджанне падзей, не цягнучыся ў хвасце падзей. Нам у гэтым напрамку ёсць над чым працаваць», — сказаў Прэзідэнт.

СТАР. 2

Па падазрэнні ў здзяйсненні тэракта затрымана пяць чалавек, у тым ліку і выканаўца

Пра гэта на вялікай прэс-канферэнцыі заявіў учора **намеснік генеральнага пракурора Беларусі, начальнік следчага ўпраўлення Андрэй ШВЕД**:

— Па падазрэнні ў здзяйсненні выбуху намі затрымана пяць чалавек, двое з іх — непасрэдны выканаўца і асоба, якая яму садзейнічала, — узятыя пад варту. Характар злачынства і яго маштаб патрабуюць яшчэ вялікіх следча-працэсуальных дзеянняў.

Паводле слоў Андрэя Шведа, падчас агляду было сабрана больш за тысячу рэчавых доказаў, праца з якімі вядзецца і сёння. З кожным пацярпелым будзе праведзеная следчая работа, каб зафіксаваць усе паказанні сведак. Пэўная частка людзей ужо апытаная.

Як паведаміў намеснік генпракурора, ужо выяўлена месца, дзе выраблялася выбуховыя рэчывы і бомба, якую тэрарыст прывёз на станцыю метро «Кастрычніцкая». На месцы вырабу бомбы выяўленыя доказы — фрагменты і дэталі, якія ў сукупнасці ўказваюць на тое, калі, з якіх матэрыялаў і якім чынам было выраблена выбуховае прыстасаванне. Дакладна вядома, што спосаб выбуху быў радыёкіруемым.

ЯК ЗНАЙШЛІ ВЫКАНАЎЦУ ТЭРАКТА?

— З першых хвілін была праведзеная вялізная аналітычная праца з усімі відэавыявамі ўсіх камер мінскага метрапалітэна, а таксама камер вонкавага назірання на вуліцах горада, — гаворыць Андрэй Швед. — Былі задзейнічаны сілы КДБ і МУС. У хуткім часе, у ноч з 11 на 12 красавіка, з вялікай доляй верагоднасці (сёння следства ўжо перакналася ў гэтым) была атрымана відэавыява злачынцы. Яе мы атрымалі дзякуючы камеры, якая зафіксавала момант, калі мужчына пакідаў месца злачынства. Аналіз гэтага і іншых відэаматэрыялаў дазволіў следству вызначыць станцыю, на якой злачынца зайшоў у метро. У ходзе аператыўна-вышукавых мерапрыемстваў былі вызначаны яго асоба і месцажыхарства.

Злачынцу і яшчэ некалькіх чалавек затрымалі. Усе яны — грамадзяне Рэспублікі Беларусь, не судзімыя раней, узрост — да 30-ці гадоў.

Намеснік генпракурора адзначыў, што праца па раскрыцці злачынства вялася і вядзецца кругласутачна і каардынуецца адпаведным штабам, створаным у КДБ.

Падчас прэс-канферэнцыі журналістам былі прадэманстраваныя здымкі з камер відэаназірання, на якіх зафіксаваны сам злачынца і яго перамяшчэнне на станцыях метро.

СТАР. 2

ЗБОР АХВЯРАВАННЯЎ

З 15 (з 10.00) да 20 красавіка ў кругласутачным рэжыме будзе працаваць гарачая тэлефонная лінія, арганізаваная сумесна з РУП «Белтэлекам», для пералічэння грамадзянамі па ўваходнаму званку Br2 тыс. Грамадзянам, якія жадаюць пералічыць грошы, неабходна набраць нумар **8810055 03 03** (поўнасцю 11 лічбаў) з любога стацыянарнага тэлефона Рэспублікі Беларусь. Для тых, хто пазваніў, будзе гучаць тэкст: «Ваша дапамога пацярпелым прынята».

НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ — ДА 18 ЦЯПЛА

Сёння і заўтра ўсталюецца спакойнае і сонечнае надвор'е, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Уначы ў гэтыя два дні ад мінус 4 да плюс 3, удзень — 7—14 цяпла. У нядзелю кароткачасовыя дажджы. Уначы на панядзелак ад мінус 2 да плюс 5, удзень — 9—14 цяпла, у Брэсцкай вобласці да плюс 16. У першы дзень наступнага тыдня невялікія дажджы чакаюцца на поўначы краіны, тэмпература ўдзень — 8—14, на поўдні — да 16 цяпла. Бліжэй да сярэдзіны наступнага тыдня ў Беларусь завітае антыцыклон з боку Заходняй Еўропы. Зноў стане сонечна і без ападкаў. Уначы ў сераду будзе да 4 цяпла, месцамі пры праясненнях падмарозіць да 3 марозу, удзень — плюс 9—16, на захадзе — да 18 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ISSN 1990 - 763X

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

ОАО «Белвнешэкономбанк»

Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 г.	2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	4,1	91779,3	69378,4
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	4,2	4217,9	3368,5
4	Средства в Национальном банке	1103	4,3	2032105,8	209565,9
5	Средства в банках	1104	4,4	407784,3	438292,7
6	Ценные бумаги	1105	4,5	261873,3	141817,5
7	Кредиты клиентам	1106	4,6	1959792,4	1255290,6
8	Производные финансовые активы	1107	4,7	49,7	47,2
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	4,8	7490,1	5871,6
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	4,9	101064,5	85485,0
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	4,10	236,4	562,0
12	Прочие активы	1111	4,11	24807,1	17323,5
13	ИТОГО активы	11		4891200,8	2227002,9
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201	4,12	1156728,2	2406,5
16	Средства банков	1202	4,13	1568733,4	440334,4
17	Средства клиентов	1203	4,14	1328254,6	985298,9
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		170,6	7517,6
19	Производные финансовые обязательства	1205	4,15	1932,6	1700,4
20	Прочие обязательства	1206	4,16	20867,4	41323,4
21	ВСЕГО обязательства	120		4076686,8	1478581,2
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211	4,17	605017,0	605017,0
24	Эмиссионный доход	1212		-	-
25	Резервный фонд	1213		36757,7	30584,0
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	4,18	72188,1	58134,9
27	Накопленная прибыль	1215	4,19	100551,2	54685,8
28	ВСЕГО капитал	121		814514,0	748421,7
29	ИТОГО обязательства и капитал	12		4891200,8	2227002,9

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 год	2009 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011	5,1	286917,7	191200,3
2	Процентные расходы	2012	5,2	97531,4	93288,4
3	Чистые процентные доходы	201		189386,3	97911,9
4	Комиссионные доходы	2021	5,3	71359,2	66550,1
5	Комиссионные расходы	2022	5,4	10969,9	7230,9
6	Чистые комиссионные доходы	202		60389,3	59319,2
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	5,5	817,0	591,8
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	5,6	70,6	18,3
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	5,7	26798,9	28713,1
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	5,8	(142,5)	4908,5
11	Чистые отчисления в резервы	207	5,9	60423,4	28782,4
12	Прочие доходы	208	5,10	11928,0	4682,3
13	Операционные расходы	209	5,11	134681,9	104185,7
14	Прочие расходы	210	5,12	16824,7	13433,4
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		77317,6	49743,6
16	Налог на прибыль	212		15585,4	17393,7
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		61732,2	32349,9
	Базовая прибыль на простую акцию (в рублях)			10,20	9,23
	Разводненная прибыль на простую акцию			10,20	9,23

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование показателей	Символ	Наименование статей капитала					
			уставный фонд	эмиссионный доход	резервный фонд	накопленная прибыль (убыток)	фонды переоценки статей баланса	всего капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9
Раздел I. За год, предшествующий отчетному								
1	Остаток на 1 января 2009 года	3011	327483.0	-	16255.7	36664.2	54415.1	434818.0
2	Изменения статей капитала	3012	277534.0	-	14328.3	18021.6	3719.8	313603.7
2.1	В том числе: совокупный доход	30121	X	X	X	32349.9	3719.8	36069.7
2.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	X	14328.4	(14328.4)	X	-
2.3	операции с учредителями (участниками)	30123	277534.0	-	X	-	X	277534.0
2.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	277534.0	-	X	X	X	277534.0
2.5	выплата дивидендов акционерам	301232	X	X	X	-	X	-
2.6	операции с собственными выкупленными акциями	301233	-	X	X	X	X	-
2.7	перераспределение между статьями капитала	30125	-	-	-	-	-	-
2.8	прочие изменения	30126	-	-	(0.1)	0.1	-	-
3	Остаток на 1 января 2010 года	3013	605017.0	-	30584.0	54685.8	58134.9	748421.7
Раздел II. За отчетный год								
4	Остаток на 1 января 2010 года	3011	605017.0	-	30584.0	54685.8	58134.9	748421.7
5	Изменения статей капитала	3012	-	-	6173.7	45865.4	14053.2	66092.3
5.1	В том числе: совокупный доход	30121	X	X	X	61732.2	14053.2**	75785.4
5.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	X	6173.2	(6173.2)	X	-
5.3	операции с учредителями (участниками):	30123	-	-	X	(9693.5)	X	(9693.5)
5.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	-	-	X	X	X	-
5.5	выплата дивидендов акционерам	301232	X	X	X	(9693.5)	X	(9693.5)
5.6	операции с собственными выкупленными акциями	301233	-	X	X	X	X	-
5.7	перераспределение между статьями капитала	30125	-	-	-	-	-	-
5.8	прочие изменения	30126	-	-	0.5*	(0.1)*	-	0.4
6	Остаток на 1 января 2011 года	3013	605017.0	-	36757.7	100551.2	72188.1	814514.0

* округления

** переоценка ОС и НС за 2010 г. 13983,5; переоценка ЦБ 89,7; сторно переоценки НС за 2009 год (20,0).

СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 год	2009 год
1	2	3	4	5	6
1	Прибыль (убыток) за отчетный период	301211		61732,2	32349,9
2	Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период	301212		14053,2	3719,8
2.1	В том числе: переоценка основных средств	3012121		13856,2	3687,6
2.2	переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования	3012122		107,3	32,2
2.3	переоценка ценных бумаг	3012123		89,7	-
2.4	переоценка инструментов хеджирования	3012124		-	-
2.5	переоценка прочих статей баланса	3012125		-	-
3	ИТОГО совокупный доход за отчетный период	30121		75785,4	36069,7

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 год	2009 год
1	2	3	4	5	6
1.	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
2.	Полученные процентные доходы	70100		258 841,3	191 164,8
3.	Уплаченные процентные расходы	70101		(86 838,5)	(92 130,9)
4.	Полученные комиссионные доходы	70102		71 191,8	66 550,7
5.	Уплаченные комиссионные расходы	70103		(10 842,0)	(7 260,9)
6.	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	70104		817,0	591,8
7.	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	70105		70,6	18,3
8.	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	70106		26 360,2	26 152,7
9.	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	70107		-	-
10.	Прочие полученные доходы	70108		7 421,5	3 161,8
11.	Прочие уплаченные расходы	70109		(142 043,0)	(111 372,8)
12.	Уплаченный налог на прибыль	70110		(15 712,9)	(17 898,5)
13.	Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах, итого	701		109 266,0	58 977,0
14.	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	70200		(1 347 243,0)	5 192,6
15.	Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках	70201		(168 700,1)	(16 807,5)
16.	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения)	70202		(124 106,6)	(137 568,0)
17.	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам	70203		(729 523,6)	4 707,5
18.	Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов	70204		6 651,2	28,3
19.	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	70205		(62 616,4)	19 833,9
20.	Потоки денежных средств от изменения операционных активов, итого	702		(2 425 538,5)	(124 613,2)
21.	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	70300		1 153 208,0	(6 174,5)
22.	Чистый прирост (снижение) денежных средств банков	70301		1 114 858,6	63 558,0
23.	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	70302		319 088,2	21 519,6
24.	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком	70303		(6 964,4)	5 829,1
25.	Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств	70304		(6 564,0)	1 305,4
26.	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	70305		8 404,9	(15 363,5)
27.	Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств, итого	703		2 582 031,3	70 674,1
28.	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности	70		265 758,8	5 037,9
29.	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
30.	Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	71100		(9 683,9)	(23 947,2)
31.	Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	71101		303,5	15 266,4
32.	Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	71102		(1 399,9)	(1 136,3)
33.	Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	71103		-	-
34.	Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения	71104		(535 273,1)	(6 537,8)
35.	Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения	71105		535 273,1	6 537,8
36.	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности	71		(10 780,3)	(9 817,1)
37.	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
38.	Эмиссия акций	72100		-	277 534,0
39.	Выкуп собственных акций	72101		-	-
40.	Продажа ранее выкупленных собственных акций	72102		-	-
41.	Выплата дивидендов	72103		(8 610,9)	(11,4)
42.	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности	72		(8 610,9)	277 522,6
43.	Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты	73		4 876,9	50 207,2
44.	Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов	74		251 244,5	322 950,6
45.	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740	1	X	524 228,2
46.	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741	1	775 472,7	X

Председатель Правления **П.В. Каллаур**

Главный бухгалтер **З.С. Кушнерова**

Дата подписания 24 января 2011 г.

Директор ИООО «Эрнст энд Янг» **П.А. Лащенко**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 6 от 27.10.2006. УНП 100010078.

ERNST & YOUNG

Ernst & Young LLC
Korol Street, 51, 2nd floor, offic 30
Minsk, 220004, Republic of Belarus

Tel: +375 (17) 209 4535
Fax: +375 (17) 209 4534
www.ey.com/belarus

ИООО «Эрнст энд Янг»
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. Короля, 51, 2 этаж, офис 30

Тел.: +375 (17) 209 4535
Факс: +375 (17) 209 4534

Аудиторское заключение независимой Аудиторской организации ИООО «Эрнст энд Янг» по годовой публикуемой финансовой отчетности ОАО «Белвнешэкономбанк», подготовленной по итогам деятельности за 2010 год

Акционерам и Наблюдательному совету ОАО «Белвнешэкономбанк»

Мы провели аудит бухгалтерского баланса Открытого акционерного общества «Белвнешэкономбанк» (далее «Банк») на 1 января 2011 года, соответствующих отчетов о прибыли и убытках, об изменении капитала и о движении денежных средств за год по указанную дату (далее «отчетные формы»). Данные отчетные формы составлены на основании годового отчета Банка с целью их обязательной публикации. Годовой отчет был подготовлен руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», «Инструкцией по ведению бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283 с изменениями и дополнениями, «Инструкцией по составлению годового отчета банками Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь» от 27 ноября 2006 года № 323 с изменениями и дополнениями, и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

Ответственность руководства

Ответственность за подготовку и представление годового отчета и прилагаемых отчетных форм в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности несет руководство Банка. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверного годового отчета и прилагаемых отчетных форм, не содержащих существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики; определение обоснованных оценочных значений.

Ответственность Аудиторской организации и описание аудита

Наша обязанность заключается в том, чтобы на основе проведенного аудита выразить мнение о достоверности данных отчетных форм.

Мы руководствовались требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 8 ноября 1994 года № 3373- XII и провели аудит в соответствии с Правилами аудиторской деятельности, утвержденными Министерством финансов Республики Беларусь. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность в отсутствии существенного искажения в прилагаемых отчетных формах.

Аудит включает выполнение процедур, направленных на получение аудиторских доказательств в отношении сумм и информации, представленных в отчетных формах. Выбор процедур основывается на суждении аудитора, включая оценку риска существенного искажения отчетных форм вследствие ошибок или недобросовестных действий. При оценке этого риска аудитор рассматривает аспекты внутреннего контроля в отношении подготовки и достоверного представления отчетных форм с тем, чтобы определить процедуры аудита, необходимые в конкретных обстоятельствах, а не для выражения мнения об эффективности системы внутреннего контроля Банка. Аудит также включает оценку уместности выбранной учетной политики и обоснованности бухгалтерских оценок, сделанных руководством Банка, и оценку представления отчетных форм в целом.

Мы считаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими для выражения нашего мнения.

Аудиторское мнение

По нашему мнению, прилагаемые отчетные формы, составленные на основании годового отчета Банка, достоверно, во всех существенных аспектах, отражают финансовое положение Банка по состоянию на 1 января 2011 года, результаты его финансово-хозяйственной деятельности и движение денежных средств за год по указанную дату в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», «Инструкцией по ведению бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283 с изменениями и дополнениями, «Инструкцией по составлению годового отчета банками Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 27 ноября 2006 года № 323 с изменениями и дополнениями, и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

Поясняющий пункт

Прилагаемые отчетные формы не имеют своей целью представление финансового положения и результатов деятельности в соответствии с принципами или методами бухгалтерского учета, общепринятыми в странах, помимо Республики Беларусь. Соответственно, прилагаемые отчетные формы не предназначены для лиц, не знакомых с принципами, процедурами и методами бухгалтерского учета, принятыми в Республике Беларусь.

Мы проводили аудит соответствия годового отчета и прилагаемых отчетных форм требованиям национальных стандартов финансовой отчетности только в части положений, регламентирующих представление и раскрытие информации в финансовой отчетности.

Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Эрнст энд Янг»

Свидетельство о государственной регистрации № 577 от 7 апреля 2005 года.

Лащенко Павел Анатольевич
Директор

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 8 от 27 октября 2004 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 14 ноября 2008 года).

Житомирская Оксана Геннадьевна
Аудитор

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Белаурусь № 0001790 от 6 июля 2007 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 35 от 12 сентября 2007 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 5 августа 2010 года).

Дата аудиторского заключения: 9 марта 2011 года.
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 9 марта 2011 года.

Председатель Правления ОАО «Белвнешэкономбанк» Каллаур П.В.

Директор ИООО «Эрнст энд Янг» Лащенко П.А.

СВЕТ СПАЧУВАЕ БЕЛАРУСІ

Кіраўніку беларускай дзяржавы Аляксандру Лукашэнку ў сувязі з гібеллю людзей ў выніку выбуху ў мінскім метро выказалі спачуванні **Прэзідэнт Славацкай Рэспублікі Іван ГАШПАРАВІЧ**, **Прэзідэнт Турцыі Абдулах ГЮЛЬ**, **Прэзідэнт Рэспублікі Таджыкістан Эмамалі РАХМОНАЎ, Прэзідэнт Палесцінскай Нацыянальнай Адміністрацыі Махмуд АБАС.**

Кіраўніку беларускай дзяржавы Аляксандру Лукашэнку ў сувязі з гібеллю людзей у выніку выбуху ў мінскім метро выказалі спачуванні **губернатар Калінінградскай вобласці Мікалай ЦУКАНАЎ, былы Прэзідэнт Украіны Віктар ЮШЧАНКА, былы Прэзідэнт Рэспублікі Югаславія Зоран ЛІЛІЧ.**

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

КРАІНЕ ПАТРАБУЮЦЦА НОВЫЯ СІСТЭМЫ ВІДЭАНАЗІРАННЯ

АСАБІСТЫ склад МУС пераведзены з 12 красавіка на ўзмоцнены рэжым нясення службы. Гэта значыць, для праваахоўнікаў адменены водпускі і выхадныя, а несці службу даводзіцца па 12 і болей гадзін у суткі. Узмоцнены рэжым працягнецца не менш як месяц. На працягу гэтага тэрміну ва ўсіх месцах масавага знаходжання грамадзян будуць праводзіцца доглядавыя мерапрыемствы. Догляд вядзецца з дапамогай спецсродкаў, у тым ліку ручных металадэтэктараў. Той, хто будзе рухацца ў бок вакзала ці ад яго з вялікімі чамаданамі і сумкамі, таксама сутыкнецца з доглядам. Што датычыцца абмежавання перавозкі буйнагабарытных рэчаў, то гэта пытанне яшчэ абмяркоўваецца, вывучаецца замежны вопыт, пасля чаго будуць уносіцца канкрэтныя прапановы.

Паводле слоў **намесніка міністра ўнутраных спраў — начальніка міліцыі грамадскай бяспекі Яўгена ПОЛУДНЯ**, яшчэ да 11 красавіка МУС падрыхтавала і накіравала ў Мінгарвыканкам інфармацыю па тэхнічных патрабаваннях да розных аб'ектаў. Усё ж такі наперадзе — чэмпіянат па хакеі, і належная тэхнічная аснашчанасць павінна быць. Зараз міністэрства рыхтуе належныя дакументы з прапановай аб неабходнасці абсталявання сістэмамі відэаназірання спартыўных арэн і стадыёнаў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

(Заканчэнне ў наступным нумары.)

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.04.2011 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША 3 052,00	1 чэшская крона 181,87	USD 28,1886	
▲ 1 еўра 4 425,09	1 польскі злоты 1 119,63	10 UAH 35,3884	
1 латвійскі лат 6 233,02	▼ 1 расійскі рубель 108,27	10000 BYR 92,4216	
1 літоўскі літ 1 280,31	1 украінская грыўня 382,82	EUR 40,8791	

Ликвидационная комиссия УП «ЛАНДЫШ» проводит повторный аукцион с применением метода понижения начальной цены по продаже следующих объектов недвижимости:

Лот 1. Склад для топлива об. пл. 68,6 кв. м, производственный цех об. пл. 272,6 кв. м, котел КСИ-0,09Т, забор чугунный, туалет кирпичный. Минская обл., Слуцкий р-н, д. Греск, ул. Минская, 1.

Начальная цена предмета аукциона	**78749426** белорусских рублей
Минимальная цена предмета аукциона	**15749885** белорусских рублей
Размер задатка	**1574988** белорусских рублей

Лот 2. Швейный цех обл пл. 394,2 кв. м. Минская обл., Слуцкий р-н, д. Греск, ул. Минская, 1.

Начальная цена предмета аукциона	**153981980** белорусских рублей
Минимальная цена предмета аукциона	**30796396** белорусских рублей
Размер задатка	**3079640** белорусских рублей

Зем. участок для обслуживания объектов будет выделен из земельного участка об. пл. 0,3272 га, находящегося в постоянном пользовании УП «Ландыш», Минская обл., Слуцкий р-н, д. Греск, ул. Минская, 1.

Задаток перечисляется на р/с 3012200130017 в ОАО «БелАПБ» г. Слуцк, МФО 153001921, УНП 600154422, УП «Ландыш».

Аукцион состоится 22.04.11 г. в 12.00 по адресу: 223610 г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 57 а. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 21.04.2011 года до 16.00 по указанному адресу.

ТЕЛ. 8 01795 2 43 26, 8 029 670 96 63.

УП «ЛАНДЫШ» проводит открытый аукцион по продаже швейного оборудования методом понижения начальной цены

№ лота	Наименование швейного оборудования	Год выпуска	Инв. №	Кол-во	Начальная цена предмета аукциона с НДС	Минимальная цена предмета аукциона без НДС
1	Парогенератор 46 РБЕ	06.2004 г.	557	1	2644790	528958
2	Парогенератор 46 РБЕ	06.2004 г.	558	1	2644790	528958
3	Парогенератор 46 РБЕ	06.2004 г.	559	1	2644790	528958
4	Стол гладильный Comel BRA SXD	06.2004 г.	560	1	1947353	389471
5	Стол гладильный Comel BRA SXD	06.2004 г.	561	1	1947353	389471
6	Стол гладильный Comel BRA SXD	06.2004 г.	562	1	1947353	389471
7	Стол гладильный Comel BRA SXD	06.2004 г.	563	1	1947353	389471
8	Стол гладильный Comel BRA SXD	06.2004 г.	564	1	1947353	389471
9	Стол гладильный Comel BRA SXD	06.2004 г.	565	1	1947353	389471
10	Пресс дублирующий «Ашима» 45»	07.2004 г.	566	1	8765275	1753055
11	Пресс д/уст блочек	10.2003 г.	664	1	396951	79390
	Итого				28780714	5756145

Задаток — 10% от указанной стоимости перечисляется на р/с 3012200130017 в ОАО «БелАПБ» г. Слуцк, МФО 153001921, УНП 600154422, УП «Ландыш».

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 22.04.2011 г. в 12.00 по адресу: 223610, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 57 а.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.04.2011 г. до 16.00 по указанному адресу.

СПРАВКИ ПО ТЕЛ. 8 01795 2 43 26, (8 029 670 96 63).

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» В СВЯЗИ С ИЗМЕНЕНИЕМ БАНКОВСКИХ РЕКВИЗИТОВ ИНФОРМИРУЕТ:

в извещение о проведении открытого аукциона, опубликованное в газете «Звязда» от 13.04.2011 г., по продаже здания неустановленного назначения, об. пл. 669,3 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Лещинского, 8, **вносится дополнение**

«с 18.04.2011 задаток 30 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369 г. Минск, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

В публикации годового баланса общества за 2010 год ОАО «Минсклифт» (в газете «Звязда» № 60 от 01.04.2011) в пунктах 3, 4 читать:

3. Начислено на выплату дивидендов	млн руб.	16	19
4. Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	руб.	42,3703	50,0656

УНП 190292990

«ТРАГЕДЫЯ НЕ ПАВІННА АЗЛОБІЦЬ ЛЮДЗЕЙ, ПАСЕЯЦЬ У ІХ ДУШАХ ЗЕРНЕ ВАРОЖАСЦІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Асаблівай размовы заслугоўвае пытанне аб узмацненні сацыяльнай актыўнасці Праваслаўнай царквы. Тут я поўнасцю салідарны з думкай патрыярха: каб заставацца магутнай і ўплывовай сілай, Царква павінна быць адкрыта свету, актыўна працаваць з людзьмі і, у першую чаргу, з моладдзю. Рэалізоўваць сацыяльныя, асветныя і культурныя ініцыятывы, далучаючы да іх не толькі прыхаджан, але і самае шырокае кола людзей», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

На думку Прэзідэнта, добрым прыкладам адраджэння традыцый сацыяльнага служэння Царкве сталі Дом Міласэрнасці, праекты дапамогі інвалідам у манастырах, былым зняволеным у праваслаўным рэабілітацыйным цэнтры вёскі Любча Барысаўскага раёна і іншыя, але пакуль нешматлікія пачынанні. Гэты вопыт варты прадаўжэння, сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён лічыць, што важнай дзейнасцю, якая патрабуе актыўнага ўдзелу Царквы, з'яўляецца захоўванне гісторыка-культурнай спадчыны, рэстаўрацыя старадаўніх храмаў. «Вам трэба перастаць спадзявацца толькі на рэсурсы дзяржавы, быць больш актыўнымі самім, шырэй прыцягваць спонсарскую дапамогу і ахвяраванні», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Для мяне сустрэчы з вамі — духоўнымі лідарамі буйнейшай канфесіі краіны — важныя, перш за ўсё, як эфектыўная форма прамога дыялога дзяржавы і Царквы, пошуку агульных і новых відаў супрацоўніцтва ў вырашэнні актуальных праблем сучаснасці», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, праваслаўе адыграла выдатную ролю ў лёсе беларускага народа, фарміраванні нашай дзяржаўнасці і развіцці культуры. «Таму сёння мы ўскладаем на Царкву вялікія надзеі ў справе патрыятычнага выхавання моладзі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт лічыць, што добрым пачынам у гэтай адказнай і вялікай рабоце стала стварэнне агульнанацыянальнага мемарыяла — Храма-помніка ў гонар Усіх Святых у Мінску. Няхай гэты праект натхніць свяшчэннаслужыцеляў, якія жадаюць унесці сваю лепту ў захаванне гістарычнай памяці, сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Умацаванне сямейных традыцый, барацьба з п'янствам, наркаманіяй, амаральнымі паводзінамі, маральная асвета — гэта таксама сфера клопату Царквы і тое поле, на якім праца свяшчэннаслужыцеляў павінна прынесці свой плён», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Дыялог паміж уладай і Царквой вядзецца па самых актуальных грамадскіх пытаннях. Аб гэтым паведаміў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх уся Беларусі на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з членамі Сінода Беларускай праваслаўнай царквы.

Мітрапаліт Філарэт высока ацаніў намаганні дзяржавы па падтрыманні міжканфесійнага міру, што асабліва важна ў сучасных умовах. Ён падкрэсліў, што гэта сустрэча з кіраўніком дзяржавы праходзіць у жалобныя дні, калі ўсе смуткуюць аб ахвярах тэракта. «Царква моліцца аб упакаванні душ, аб выздараўленні параненых. Гэта гора павінна з'яднаць нас, нагадаць аб каштоўнасці міру», — сказаў Уладыка Філарэт.

Патрыяршы Экзарх таксама адзначыў, што ў красавіку адзначаецца сумны юбілей — 25 гадоў аварыі на ЧАЭС. Гэта чорная старонка ў гісторыі Беларусі, падкрэсліў ён. Паводле слоў Мітрапаліта Філарэта, чарнобыльская трагедыя, таксама як і японскія падзеі, нагадваюць чалавецтву аб тым, наколькі неабаронены свет.

Па падазрэнні ў здзяйсненні тэракта затрымана пяць чалавек, у тым ліку і выканаўца

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У ВЯДЗЕННІ СЛЕДСТВА БЕЛАРУСАМ ДАПАМАГЛІ КАЛЕГІ З РАСІІ

Паводле слоў Андрэя Шведа, з першых гадзін пасля трагедыі ў Генеральную пракуратуру паступіла некалькі тысяч паведамленняў:

— Кожную інфармацыю і кожны званок мы правяраем. З гэтай мэтай у нас сканцэнтраваныя пэўныя сілы і сродкі. Пэўны аб'ём атрыманай такім чынам інфармацыі аказаў садзейнічанне ў раскрыцці злачынства.

Акрамя таго, як дадаў Андрэй Іванавіч, літаральна адразу на дапамогу беларускім спецыялістам прыбылі супрацоўнікі Следчага камітэта Расіі, а таксама спецыялісты-выбухатэхнікі ФСБ Расіі, якія працавалі на месцы здарэння з пацярпелым электрацягніком і якія працуюць над аналізам рэчавых доказаў сумесна з беларусамі і сёння.

З ЧАГО БЫЛА ВЫРАБЛЕНАЯ БОМБА?

Падчас працы на месцы трагедыі асаблівая ўвага надавалася агляду пацярпелага электрацягніка. Ажыццяўляўся збор доказаў. Як гавораць эксперты, усё было зроблена для таго, каб мець яскравае ўяўленне пра характарыстыкі выбуховага ўстройства.

— Папярэдняе следства характарызуецца яскравасцю і зразумеласцю, — адзначае **намеснік начальніка следчага ўпраўлення Генеральнай пракуратуры Максім ВАРОНІН**. — Неабходныя ўзоры ўзяты і прызначаны адпаведныя экспертызы. Дастаткова і аргументаваных меркаванняў, аднак у інтарэсах следства я не буду іх агучваць.

Як дадаў Андрэй Швед, сёння дакладна вядома, што бомба была выраблена не ў Мінску. Адносна яе начынкі ён сказаў наступнае:

— Бяспрэчна, паражаючыя элементы ў бомбе былі. Вельмі шмат іх выяўлена на месцы злачынства, таксама яны былі адабраныя з целаў загінулых і пацярпелых. Паражаючыя элементы былі некалькіх відаў, якіх — у інтарэсах следства не агучваецца.

Што датычыць ролі затрыманых (хто выступіў заказчыкам, а хто выканаўцам), то ў інтарэсах следства гэтую інфармацыю не каментуюць. Аднак, як падкрэсліў Андрэй Швед, у следства дастаткова доказаў таго, што выканаўца тэракта 11 красавіка — гэта адзін з пяці затрыманых асоб, і менавіта гэтая асоба вырабіла выбуховае прыстасаванне, выяўленае трэцяга ліпеня 2008 года. Паводле слоў Шведа, матывы злачынцаў яшчэ будуць высветленыя. Як толькі матыў будзе замацаваны доказамі, інфармацыю пракаментуюць.

Ілья ЛАПАТО.

ТЫМ ЧАСАМ:

СТУДЭНТЫ БДУ ЗБІРАЮЦЬ СРОДКІ ДЛЯ ПАЦЯРПЕЛЫХ

У рэдакцыю патэлефанавалі студэнты юрыдычнага факультэта БДУ, якія арганізавалі на сваім факультэце збор сродкаў для пацярпелых ад тэракта 11 красавіка. Дабрачынная акцыя была ініцыяваная студэнтамі 4-га курса, і на 14 красавіка ў ёй прыняло ўдзел 106 чалавек — у асноўным студэнты і выкладчыкі факультэта. За дзень было сабрана больш за Br 600 тысяч.

Беларусы пералічылі ў адрас пацярпелых у мінскім метро звыш Br819 млн

Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Мінгарвыканкама.

«На дабрачынныя рахункі Мінгарвыканкама, адкрытыя для залічэння ахвяраванняў у сувязі з трагічнымі падзеямі, якія здарыліся 11 красавіка на станцыі метро «Кастрычніцкая», па стану на 14.20 14 красавіка паступіла Br819 284 418», — паведамілі ў прэс-службе. Пры гэтым тут адзначылі, што за мінулыя суткі сума ахвяраванняў значна ўзрасла.

Нагадаем, што ахвяраванні ў адрас пацярпелых у мінскім метро можна пералічваць у чатырох валютах на дабрачынныя рахункі ў аддзяленні нумар 539 ААТ «Белінвестбанк», код 739. Ахвяраванні ў беларускіх рублях трэба пералічваць на нумар рахунку 3642740104035 (код валюты 974), у расійскіх рублях на нумар рахунку 3642740104064 (код валюты 643), у доларах ЗША на нумар рахунку 3642740104048 (код валюты 840), у еўра — 3642740104051 (код валюты 978).

Бенефіцыяр Мінгарвыканкам, УНП 100621571.

Тэлефон даведачнай службы ААТ «Белінвестбанк» — 146.

Меркаванне ізраільскіх спецыялістаў:

«ЛЮДЗІ НА МЕСЦЫ ТЭРАКТА ІНТУІТЫЙНА ПАВЯЛІ СЯБЕ ПРАВІЛЬНА...»

ТРЫ дні назад у Беларусь прыбыла група ізраільскіх экспертаў для садзейнічання беларускім калегам у расследаванні тэракта на станцыі метро «Кастрычніцкая» і аказання кансультатыўнай дапамогі беларускім медыкам, якія змагаліся за жыццё пацярпелых. У склад ізраільскай дэлегацыі ўвайшлі тры медыцынскія эксперты, эксперты ў галіне барацьбы з тэрорам і прадстаўнікі Службы агульнай бяспекі.

— Ізраіль і Беларусь аб'ядноўваюць шматгадовыя сяброўскія зносіны, таму, як толькі стала вядома аб тэракце ў Мінску, для ізраільцян было абсалютна відавочным, што мы павінны адправіць сваю дапамогу ў Беларусь, — паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі **Часовы Павераны ў справах Пасольства Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Асаф БРАХА**. — Я хачу выказаць ад усяго ізраільскага народа глыбокія спачуванні ўсім, хто страціў сваіх блізкіх і сяброў. Мы шлём беларускаму народу свае малітвы і вельмі спадзяёмся, што ў будучыні беларусы больш ніколі не падвергнуцца тэрарыстычным атакам. Спадзяёмся, што наша дапамога ў сувязі з трагічнымі абставінамі патрабуецца вам у апошні раз.

Начальнік упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя нашай краіны Іван РЫЖКО, які таксама ўзяў удзел у прэс-канферэнцыі з нагоды ад'езду з Беларусі ізраільскіх медыкаў, прызнаўся, што, на шчасце, у беларусаў да апошняга моманту не было багатага досведу, як дзейнічаць у сітуацыях , калі вялікая колькасць людзей становяцца аб'ектам тэрарыстычнай атакі. Таму беларускія медыкі з удзячнасцю прынялі дапамогу іх калег з Ізраіля і Расі, у якіх, ёсць досвед работы пры катастрофах (і тэхнагенных, і прыродных), і канешне, пры ліквідацыі наступстваў тэрактаў.

Для прыкладу, падпалкоўнік **Элан ГЛАСБЕРГ, кіраўнік аддзела траўмы Ізраільскай арміі**, хірург, які ўзначаліў групу ізраільскіх медыкаў, толькі тыдзень назад вярнуўся з Японіі. **Маёр, камандзір медыцынскага аддзела Паўднёвай дывізіі ізраільскай арміі Морыс БАТУМСКІ** прымаў удзел у арганізацыі бальніцы ў палявых умовах для пацярпелых у выніку землятрусу на Гаіці. За час работы ў Мінску ізраільскія спецыялісты наведалі 4-ю гарадскую клінічную бальніцу, гарадскую бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі, шпіталі Міністэрства абароны і Міністэрства ўнутраных спраў, сустрэліся са сваімі калегамі са Службы хуткай медыцынскай дапамогі. Як падкрэсліў у сваім выступленні Элан Гласберг, неабходнасці ўмяшання непасрэдна ў працэс лячэння пацярпелых не было, паколькі ўсе яны атрымліваюць адэкватную кваліфікаваную дапамогу. Таму асноўная ўвага была сканцэнтраваная на аказанні кансультатыўнай дапамогі, як дзейнічаць у падобных сітуацыях у будучыні. Ізраільскія спецыялісты адзначылі, што хоць у беларусаў і няма той падрыхтоўкі і тых ведаў, якія прывіваюцца ўсім грамадзянам Ізраіля з маленства, тым не менш людзі, якія аказаліся на месцы тэракта і побач з месцам трагедыі інтуітыўна павялі сябе правільна. Ізраільскія спецыялісты адсачылі літаральна ўсе падзеі і дзеянні з моманту выбуху. Аднак яны ўпэўненыя, што спадзявацца толькі на інтуіцыю ў далейшым было б недаравальным...

(Заканчэнне чытайце ў наступным нумары)

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАКУЛЬ ІДЗЕ СЛЕДСТВА...

У Баранавічах пахавалі 27-гадовую Вольгу Салаўёву, якая загінула 11 красавіка ў метро. Знаходзіцца ў бальніцы з траўмамі і 23-гадовы хлопец — жыхар горада. Ён у сталіцы працаваў на будоўлі.

Выбух у сталічным метро ўскалыхнуў усю Беларусь і прывёў людзей у замяшанне, збянтэжанасць, бо ніякіх падстаў для такога тэракту ў нашай краіне не было. Беларусь далёкая ад ваенных, міжнацыянальных... канфліктаў, і нікому ў галаву не магло прыйсці, што ў нас такое можа здарыцца.

Праўда, быў выбух на святкаванні Дня незалежнасці ў 2008 годзе, але ў тым тэракце ніхто не загінуў і пасля года следства яго кваліфікавалі як злоснае хуліганства. І вось праз два гады...

Пасля таго, як выказаліся Прэзідэнт Беларусі, кіраўнікі сілавых структур, цяжка сказаць штосьці новае. Хачу толькі звярнуць увагу на адну акалічнасць. Сумна, што трагедыя на станцыі метро «Кастрычніцкая» пачала разглядацца праз палітычную прызму.

У заходніх СМІ, як і ў некаторых апазіцыйных колах, паспяшаліся заявіць, што гэты тэракт на руку ўладзе, якая такім чынам хоча адцягнуць увагу насельніцтва ад эканамічных праблем.

Сілавыя структуры спрацавалі аператыўна і затрымалі траіх чалавек, якія далі паказанні і ва ўсім прызналіся.

Загінулі людзі, многія пакалечаны, пралілася кроў. І тым не менш, як бы балюча ні было, але заклікі «разарваць на кавалкі» ці «чвартаваць» трэба ўспрымаць як эмацыянальны ўсплёск. Закон павінен быць вышэй за эмоцыі.

Пакуль вядзецца следства, не трэба рабіць паспешлівых вывадаў, няхай крымінальная справа дойдзе да суда і там вырашаюць.

Магчыма, хтосьці на гэтай трагедыі і хацеў бы набыць палітычны капітал, але ёсць маральная мяжа, якую нельга пераступаць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

МІНЭКАНОМІКІ АДМЯНІЛА 4 ПАСТАНОВЫ ПА ЦЭНАЎТВАРЭННІ

Паведамілі **БЕЛТА** ў прэс-службе Мінэканомікі. З адменай гэтых пастаноў суб'екты прадпрымальніцкай дзейнасці самастойна вызначаюць узровень цэн (тарыфаў) на вырабленыя і рэалізуемыя тавары (работы, паслугі) з улікам існуючай кан'юнктуры рынку. Выключэнне складаюць тавары (работы, паслугі), адносна якіх ажыццяўляецца дзяржаўнае рэгуляванне цэн (тарыфаў) па пераліку, зацверджаным указам ад 25 лютага 2011 года № 72 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання цэн (тарыфаў) у Рэспубліцы Беларусь».

НІЯКАГА КАЗІНО Ў БЕЛАРУСКІМ ПАСОЛЬСТВЕ Ў МАСКВЕ НЯМА І БЫЦЬ НЕ МАГЛО

Пра гэта гаворыцца ў каментарыі начальніка ўпраўлення інфармацыі — прэс-сакратара МЗС Беларусі Андрэя Савіных у сувязі з публікацыяй у газеце «Известия» ад 14 красавіка 2011 года, паведамляе **БЕЛТА**. «Калі б журналіст газеты «Известия» звярнуўся да пасла Беларусі з гэтым пытаннем, то неадкладна атрымаў бы поўны і вычарпальны адказ. Тым не менш газета вырашыла распаўсюдзіць «сенсацыйную» фальшыўку», — паведамляецца ў каментарыі. «Трэба адзначыць, што гэта далёка не першы выпадак. «Известия» не пасаромеліся надрукаваць паклёп на Беларусь аб продажы баявых верталётаў у Кот-д'Івуар, пра беларускіх наёмнікаў у Лівіі. Паколькі газета выступала ўсяго толькі дробным саўдзельнікам прапагандысцкай акцыі заходніх СМІ, мы не сталі звяртаць на гэта ўвагу», — сказаў прэс-сакратар МЗС Беларусі. Чарговая хлусня ў адрас Беларусі выкрыта. Пытанне атрымала сваё лагічнае завяршэнне. Аднак на другое пытанне па-ранейшаму няма адказу: чаму ў знешне рэспектабельных расійскіх СМІ праразаюцца рэфлексы «жоўтай прэсы», калі размова заходзіць пра Беларусь? На працягу гадзіны пасля з'яўлення публікацыі ва ўчарашнім нумары газеты «Известия» пасол Беларусі ў Расіі Васіль Далгалёў запрасіў усіх зацікаўленых журналістаў на экскурсію па пасольстве. Прадстаўнікам СМІ прадастаўлена магчымасць наведаць любыя памяшканні па іх жаданні, паведамілі ў прэс-службе МЗС Беларусі.

Вікторыя АЗАРАНКА:

«НЕЛЬГА СКАЗАЦЬ, ШТО Я ВЕЛЬМІ СВЕЖАЯ, АЛЕ ГЭТА — НЕ ПЕРАШКОДА»

Нашы тэнісісткі ў выхадныя правядуць у Мінску матч Кубка Федэрацый

ЖАНОЧАЯ каманда Беларусі па тэнісе рыхтуецца да матча плэй-оф 2-й Сусветнай групы Кубка Федэрацый супраць каманды Эстоніі. Гэта першы матч кубка Федэрацый, які пройдзе ў Мінску. Але для балельшчыкаў ён цікавы яшчэ і тым, што ў складзе нашай каманды ёсць Вікторыя Азаранка. Адна справа назіраць па тэлеканале «Еўраспорт» матч паміж Вікторыяй і скажам, Машай Шарапавай з іх пранізлівымі крыкамі. І зусім іншае — чуць гэта ўжывую...

Пасля выйгрышу двух турніраў (у Маямі, дзе Азаранка зарабіла 700 тысяч долараў, і іспанскай Марбеллі, дзе выйгрыш склаў 35 тысяч долараў) загарэлая і задаволеная Віка прыбыла ў Мінск. Праўда, на яе адносінах з журналістамі добры настрой ніяк не адбіўся — Віка вядомая сваім нежаданнем кантактаваць з прэсай. Але ж на некалькі пытанняў на прэс-канферэнцыі яна вымушаная была адказаць.

— Я рада, што прыехала ў Беларусь. Чакаем матчу, спадзяёмся на добры вынік.

— Вы засмучаны, што ў Мінск не прыедзе першая ракетка эстонскай каманды Кая Канэпі?

— Зусім не. Прыехалі іншыя тэнісісткі, якія будуць змагацца.

— Суперніцтва будзе сур'ёзным?

— А вы як думаеце? — спытала Віка ў журналіста.

— Я не прафесіянал.

— Так, будзе сур'ёзным.

— Вы часта мяняеце пакрыццё — харт, грунт... Як удаецца пазбягаць траўмаў?

— Ёсць чараўнік, які са мной усюды ездзіць. Гэта доктар, які дапамагае мне аднаўляцца, каб пераход з грунту на харт быў не такім балючым.

— Раскажыце пра вашу каманду. Колькі спецыялістаў разам з вамі ездзіць на турніры?

— Акрамя доктара, гэта мой трэнер па тэнісе і трэнер па фітнэсе.

— Пасля выйгрышу двух апошніх турніраў не адчуваеце стомленасці?

— Фон стомленасці ёсць, нельга сказаць, што я вельмі свежая. Але не бачу ў гэтым вялікай перашкоды.

— Ці наведвалі вы месца выбуху ў Мінску, якую-небудзь бальніцу, дзе знаходзяцца пацярпелыя?

— Я хацела б гэта зрабіць. Але мы трэніруемся да матчу... Гэта сур'ёзная трагедыя, цяжка знайсці словы. Складана гэта каментаваць.

На наступны дзень пасля трагедыі, дарэчы, Віка напісала на сваёй старонцы ў інтэрнэце словы падтрымкі беларусам:

«Я не магу паверыць у тое, што адбылося ў Мінску. Я не магу перастаць думаць пра сваіх суайчыннікаў, пра свой народ. Што адбываецца з гэтымі людзьмі, якія здзяйсняюць падобныя зверствы! У мяне проста няма слоў. Загінула і пакалечана так шмат людзей. Мае глыбокія спачуванні ўсяму беларускаму народу. Я малюся і выказваю яму поўную падтрымку».

Тэнісны матч пройдзе ў Мінску 16-17 красавіка, і меры бяспекі на ім у сувязі з апошнімі падзеямі будуць узмоцненыя. Акрамя Вікторыі, у нашай камандзе Вольга Гаварцова, Дар'я Кустава і Таццяна Пучак. Капітанам беларускай каманды будзе Сяргей Цяцерын:

— Упершыню ў Беларусі пройдзе тэнісны матч Кубка Федэрацый. Гэта сапраўднае свята для ўсіх аматараў тэнісу. Спадзяюся, што будзе правільны вынік, — сказаў Сяргей Сямёнавіч.

— Сяргей Сямёнавіч, а чаму ў нашай каманды так часта мяняюцца капітаны? За непрацяглы час на капітанскім мосціку пабывалі і Наталля Зверава, і Уладзімір Валчкоў, які з'ехаў зараз у Маскву...

— Гэта больш да іх пытанне, чаму яны з'ехалі. Наташа сышла ў дэкрэтны адпачынак. У суботу, дарэчы, ёй спаўняецца 40 гадоў. Гэта чалавек, які пакінуў вялікі след у савецкім, і ў сусветным тэнісе. Валчкоў з'ехаў у Маскву па асабістых прычынах, якія мне не зусім зразумелыя. Кожны з іх усё роўна вернецца і знойдзе сябе тут.

— Вы раней працавалі толькі з мужчынскай камандай. З дзяўчатамі гэта ваша першая спроба...

— Я і сам пакуль не ведаю, як атрымаецца. Але прыкладу ўсе намаганні для перамогі, — запэўніў Сяргей Цяцерын.

На шляху да гэтага плэй-оф наша каманда перамагла ў 1-й групе Аўстрыю, Харватыю, Грэцыю і Польшчу. Зараз наша каманда ў рэйтынгу 19-я, а Эстонія — 13-я. Матч Беларусь — Эстонія пройдзе ў Палацы спорту. У суботу ён пачнецца ў 14 гадзін, у нядзелю — у 12.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Заявы ў інтэрнэце аб быццам бы зачыстцы палітычнага поля ў Беларусі з'яўляюцца абсалютнай лухтой

Выказванні ў інтэрнэце, у якіх трактуюць заяву Прэзідэнта Беларусі аб быццам бы зачыстцы палітычнага поля, з'яўляюцца абсалютнай хлуснёй і не маюць пад сабой ніякай падставы. Аб гэтым заявіў 13 красавіка журналістам першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Радзькоў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Наш Прэзідэнт ніколі не быў супраць апазіцыі, — канстатаваў Аляксандр Радзькоў. — Апазіцыя ёсць у любой цывілізаванай дзяржаве. І яна ў нас заўсёды была, але справа не ў апазіцыі, а ў канкрэтных людзях, якія выходзяць з заявамі, што выразна пацвярджаюць: яны і ёсць «пятая калона».

Паводле слоў першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі, гэта тыя людзі, якія выступаюць супраць свайго народа. «Як можна ў дні трагедыі выступаць за санкцыі супраць людзей, якія цяпер у горы? — выказаў здзіўленне Аляксандр Радзькоў. — Я тут абсалютна згодны з Прэзідэнтам, што гэта сапраўды «пятая калона», тыя, хто заўсёды выступаў супраць свайго народа».

Ён працытаваў выказванні ў інтэрнэце некаторых вядомых палітыкаў і журналістаў, якія сцвярджаюць, што тэракт у метро нібыта быў камусьці выгадны, каб адцягнуць народ ад эканамічных праблем. Больш таго, яны абвінавачваюць у гэтым Прэзідэнта.

